Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Вучэбна-метадычнае аб’яднанне па адукацыі
ў галіне культуры і мастацтваў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# МАЙСТЭРСТВА АКЦЁРА

*Тыпавая вучэбная праграма*
*для ўстаноў вышэйшай адукацыі па напрамках спецыяльнасці*
*1-17 02 01-04 Харэаграфічнае мастацтва (народны танец),*
*1-17 02 01-05 Харэаграфічнае мастацтва (бальны танец),*
*1-17 02 01-06 Харэаграфічнае мастацтва (эстрадны танец)*

Мінск
БДУКМ
2012

**Складальнік**

*М. В. Камінскі,* дацэнт кафедры харэаграфіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**Рэцэнзенты:**

*кафедра* тэорыі і методыкі выкладання мастацтваў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»;

*М. В. Філатава,* дацэнт кафедры акцёрскага майстэрства ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў»

**Рэкамендавана да зацвярджэння ў якасці тыпавой:**

*кафедрай* харэаграфіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 18 ад 01.04.2011г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 6 ад 10.05.2011г.);

*навукова-метадычным* саветам па харэаграфіі і мастацтве эстрады Вучэбна-метадычнага аб'яднання па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў (пратакол № 2 ад 11.06.2011г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю *В. Б. Кудласевіч*

Адказны за выпуск *М. В. Камінскі*

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Тыпавая вучэбная праграма «Майстэрства акцёра» распрацавана для ўстаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту па спецыяльнасці 1-17 02 01 Харэаграфічнае мастацтва (па напрамках) (напрамкі спецыяльнасці 1-17 02 01-04 Харэаграфічнае мастацтва (народны танец), 1-17 02 01-05 Харэаграфічнае мастацтва (бальны танец), 1-17 02 01-06 Харэаграфічнае мастацтва (эстрадны танец).

Праграма складзена з улікам сувязей з дысцыплінамі «Мастацтва балетмайстра», «Новыя кірункі сучаснай харэаграфіі», «Народна-сцэнічны танец», «Спартыўна-бальны танец», «Эстрадны танец».

*Мэта дысцыпліны* – фарміраванне ў студэнтаў навыкаў выкарыстання танцавальнай лексікі як спосабу псіхафізічнага ўзаемадзеяння з партнёрам (аб'ектам) у рамках імправізацыйнай пабудовы драматычнай сітуацыі.

*Задачы дысцыпліны:*

– знаёмства са спецыфікай выкарыстання акцёрскіх навыкаў у харэаграфічнай кампазіцыі;

– авалоданне элементамі сцэнічнага самаадчування ва ўмовах імправізацыйнага паказу;

– фарміраванне ў студэнта абагульненага спосабу работы над роляй;

– набыццё ведаў і ўменняў стварэння танцавальна-драматычных эцюдаў на падставе ўласнага або літаратурнага матэрыялу.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен *ведаць:*

– спецыяльную тэрміналогію прадмета і асноўныя паняцці сістэмы К. С. Станіслаўскага;

– мастацка-псіхалагічныя прынцыпы творчасці акцёра;

– метады работы акцёра над сабой, над роляй;

– спосабы развіцця і ўдасканалення элементаў унутранай і знешняй акцёрскай тэхнікі, пластычнай выразнасці.

У выніку засваення гэтых ведаў студэнт павінен *умець:*

– кіраваць уласным сцэнічным самаадчуваннем ва ўмовах тэатралізаванага паказу, драматычнай сітуацыі;

– выконваць танцавальныя камбінацыі ў зададзеным настроі або дзейснай задачы;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– пераводзіць танцавальна-пластычныя рухі і камбінацыі ў спосабы псіхалагічнага ўздзеяння на партнёра;

– выкарыстоўваць прыёмы пераўвасаблення ў вобраз персанажа, ствараць цэласную мадэль паводзін, зносін персанажа з іншымі дзеючымі асобамі;

– арганічна, паслядоўна і мэтазгодна дзейнічаць на працягу выступлення ў рамках сваёй ролі;

– мэтанакіравана прымяняць акцёрскія навыкі пры падрыхтоўцы харэаграфічных кампазіцый, у тым ліку і на іншых спецыяльных дысцыплінах;

– уздзейнічаць на партнёра і ўзаемадзейнічаць з ім у сітуацыі сцэнічных зносін;

– хутка пераходзіць з аднаго псіхафізічнага стану ў другі.

Дысцыпліна «Майстэрства акцёра» складаецца з лекцыйных, практычных, індывідуальных заняткаў і самастойнай работы студэнтаў.

Задача лекцыйных заняткаў і тэарэтычных тлумачэнняў – азнаямленне з гісторыяй развіцця, тэорыяй і псіхафізіялогіяй акцёрскай ігры; методыкай пластычнага выхавання сучаснага акцёра; параўнальны аналіз акцёрскіх і танцавальных методык навучання, шляхоў пашырэння і ўзбагачэння дыяпазону творчага мыслення студэнта-харэографа. Для больш эфектыўнага фарміравання ведаў і ацэначных меркаванняў па асобных тэмах выкарыстоўваюцца тэхнічныя сродкі навучання, у прыватнасці прагляд фрагментаў з харэаграфічных спектакляў, мастацкага і дакументальнага кіно, канцэртных выступленняў.

На практычных занятках адпрацоўваюцца элементы ўнутранай і знешняй акцёрскай тэхнікі; фарміруюцца навыкі выканання танцавальных камбінацый у працэсе вырашэння дзейснай задачы, у зададзеным настроі; вывучаюцца прыёмы пераводу танцавальна-пластычных рухаў і камбінацый у прыёмы псіхалагічнага ўздзеяння на партнёра; набываюцца навыкі пераўвасаблення ў вобраз персанажа; выхоўваюцца ўменні мэтанакіраванага выкарыстання акцёрскіх навыкаў пры падрыхтоўцы харэаграфічных кампазіцый, у тым ліку на занятках па іншых спецыяльных дысцыплінах.

Асобнае месца ў практычных занятках займаюць азнаямленне з методыкай рэпетыцыйнай працы тэатральнага калектыву; адпрацоўкі эцюдаў на псіхафізічнае ўзаемадзеянне; замаца-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ванне навыкаў правільнага сцэнічнага самаадчування ў драматычнай сітуацыі.

Індывідуальныя заняткі накіраваны на выяўленне, развіццё і ўдасканаленне пластычнай выразнасці; раскрыццё асабістага творчага мыслення студэнта.

Навучальная дысцыпліна прадугледжвае значную частку самастойнай работы студэнтаў з мэтай паглыблення ў сферу тэатральнага мастацтва. Складаючы канспекты, працуючы над творчымі дзённікамі, студэнты замацоўваюць спецыяльную тэрміналогію прадмета і асноўныя паняцці сістэмы К. С. Станіслаўскага, знаёмяцца з мастацка-псіхалагічнымі прынцыпамі творчасці акцёра, вучацца сістэматызаваць уласны эмацыянальны і тэхнічны вопыт увасаблення «жыцця чалавечага духу», набыты падчас заняткаў, сцэнічных выступленняў ці іншай творчай працы.

Тыпавым вучэбным планам спецыяльнасці ў якасці формы выніковага кантролю па дысцыпліне «Майстэрства акцёра» прадугледжаны экзамен, дзе студэнты дэманструюць набытыя веды і выканальніцкія навыкі ў галіне тэатральнага і харэаграфічнага мастацтваў. Для выяўлення ўзроўню вучэбных дасягненняў студэнтаў рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавую сістэму ацэнкі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці студэнтаў, комплексныя рознаўзроўневыя заданні. Ацэнка вучэбных дасягненняў студэнта праводзіцца на падставе дзесяцібальнай шкалы.

Тэхналагічны інструментарый выкладчыка дысцыпліны ўлічвае выкарыстанне наступных педагагічных тэхналогій і метадаў навучання: вывучэнне новага матэрыялу ажыццяўляецца рэпрадуктыўным і часткова пошукавым метадам, у працэсе ўдасканалення выканальніцкіх навыкаў актыўна выкарыстоўваюцца гульнявыя тэхналогіі, пры падрыхтоўцы выніковага эцюда ўжываюцца элементы праектнай тэхналогіі.

Дысцыпліна разлічана на 110 гадзін, з якіх 50 гадзін складаюць аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 2, практычныя – 44, індывідуальныя – 4.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Тэмы | Колькасць аўд. гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|
| | усяго | лекц. | практ. | інд. |
| Уводзіны | 1 | 1 | | |
| *Тэма 1.* Прырода акцёрскай ігры | 4 | 1 | 2 | 1 |
| *Тэма 2.* Сцэнічная ўвага | 2 | | 2 | |
| *Тэма 3.* Вызваленне мышцаў ад заціску | 4 | | 4 | |
| *Тэма 4.* Тэмпарытм сцэнічнага дзеяння | 4 | | 4 | |
| *Тэма 5.* Пабудова статычнай кампазіцыі | 2 | | 2 | |
| *Тэма 6.* Пабудова пластычнай фразы | 2 | | 2 | |
| *Тэма 7.* Прынцыпы псіхафізічнага ўзаема-дзеяння з партнёрам | 6 | | 6 | |
| *Тэма 8.* Прыёмы пластычна-вобразнай тэхнікі | 5 | | 4 | 1 |
| *Тэма 9.* Эмацыянальны рух | 4 | | 4 | |
| *Тэма 10.* Праца акцёра над роляй | 4 | | 4 | |
| *Тэма 11.* Характарнасць вобраза | 5 | | 4 | 1 |
| *Тэма 12.* Эцюдная работа | 7 | | 6 | 1 |
| **Разам…** | **50** | **2** | **44** | **4** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## Уводзіны

Прадмет, задачы і структура дысцыпліны «Майстэрства акцёра». Месца дысцыпліны ў прафесійнай падрыхтоўцы студэнтаў-харэографаў і яе сувязі з іншымі дысцыплінамі.

Патрабаванні да студэнта-харэографа на занятках па дысцыпліне «Майстэрства акцёра». Патрабаванні да ўзроўню ведаў, уменняў і навыкаў акцёрскай школы, неабходных спецыялісту ў галіне харэаграфічнага мастацтва. Крытэрыі ацэнкі навучальных дасягненняў студэнтаў, метады і спосабы ацэньвання.

Агляд літаратуры і работа з навучальна-метадычным комплексам па дысцыпліне.

## *Тэма 1. Прырода акцёрскай ігры*

Тэхніка акцёра ў заходняй і рускай тэатральнай школе. Асоба акцёра ў культурным і сацыяльным жыцці грамадства. Мастацка-псіхалагічныя прынцыпы творчасці акцёра.

Галоўныя прынцыпы сістэмы К.С.Станіслаўскага – жыццёвая праўда, актыўнасць і дзеянне, арганічнасць, пераўвасабленне, вучэнне аб звышзадачы.

Унутраныя элементы сцэнічнага самаадчування: вызваленне мышцаў, дзеянне, прапанаваныя абставіны, уяўленне, сцэнічная ўвага, пачуццё праўды, логіка і паслядоўнасць, вера і сцэнічная наіўнасць, эмацыянальная памяць, зносіны, тэмпарытм, характарнасць, мізансцэна, звышзадача і скразное дзеянне. Спецыяльная тэрміналогія тэатральнага мастацтва.

Майстэрства акцёра ў харэаграфічнай кампазіцыі. Методыка выхавання майстэрства акцёра. Імправізацыя ў метадах навучання майстэрству акцёра. Адзіныя прынцыпы акцёрскага і танцавальнага трэнажу.

Трэнаж пластычнай выразнасці акцёра як універсальная форма ўдасканалення выканальніцкага майстэрства артыста.

## *Тэма 2. Сцэнічная ўвага*

Прырода сцэнічнай увагі. Выхаванне навыкаў самавольнай увагі. Засяроджванне на дадзеным аб’екце. Абстрагаванне ад знешніх раздражняльнікаў. Аб’екты – кропкі ўвагі. Кола ўвагі рэальнай плоскасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Засяроджванне і ўтрыманне ўвагі пры звужэнні і пашырэнні кола ўвагі. Апраўданне вымыслам працэсу ўвагі. Развіццё навыкаў індывідуальнай работы ва ўмовах «публічнай адзіноты».

Увага да працэсаў, працякаючых у псіхафізічным апараце выканаўцы – адчуванняў мышачных (тэмпература, ступень напружання мышцаў, ціску на апору і г.д.), зрокавых, смаку і інш. Асаблівасці ўспрымання прасторы сцэны, дэкарацыйнага вырашэння, светлавога афармлення, дзеянняў партнёраў, музычнага суправаджэння.

Развіццё стойкасці ўвагі. Многаплоскасная ўвага. Ілюзія адначасовасці і бесперапыннасці працэсу ўвагі да некалькіх аб’ектаў.

Увага як сродак здабывання творчага матэрыялу.

### *Тэма 3. Вызваленне мышцаў ад заціску*

Псіхафізічная прырода заціску. Эмацыянальна-цялесныя блокі. Мышачны характарны «панцыр».

Спосабы выкаранення псіхафізічных заціскаў: спалучэнне дыхання з рухам, работа з цэнтрам цяжару, кіраванне напружаннем, практыкаванні на памяць фізічных дзеянняў.

*Дыханне і рух*. Дыхальны апарат. Дыяфрагмальны і шкілетны тып дыхання. Умоўна-рэфлекторныя сувязі рытму дыхання. Правільнае дыханне падчас выканання харэаграфічных элементаў і практыкаванняў на спалучэнне дыхання з рухам. Індывідуальныя і групавыя дыхальныя псіхатэхналогіі, арыентаваныя на інтэграцыю асобы і пабудову гарманічнага руху.

Развіццё дыхальных мышцаў. Сінхранізацыя, рэзананс рытмаў дыхання і руху, узаемнае ўзмацненне і падтрымка.

*Цэнтр цяжару і кропкі апоры*. Перанос цэнтра цяжару, імгненная арыенціроўка пры знаходжанні агульнага цэнтра мас у працы з партнёрам. Работа з вынесеным цэнтрам цяжару.

*Расслабленне і мера напружання*. Кіраванне сваім напружаннем. Падпарадкаванне мышцаў свайму намеру. Атрыманне правільнага адчування дадзенага дзеяння. «Закон эканоміі энергіі» як крытэрый адбору дзеянняў, сутнасць якога – дасягненне найбольшай выразнасці пры найменшым выкарыстанні энергіі.

### *Тэма 4. Тэмпарытм сцэнічнага дзеяння*

Узаемазалежнасць знешняга (фізічнага) і ўнутранага (псіхалагічнага) рытму. Рытм, тэмп, такт, метр. Эрганамічныя якасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выкарыстання пластычнага рытму. Прынцып ураўнаважвання сіл – аснова рытму ў прасторы. Монадзеянне і камбінаваныя рухі.

Сістэма па развіцці рытма-валявых якасцей. Трэнаж рытмічнасці пад музыку. Здольнасць акцёра адчуваць эмацыянальны і рытмічны строй музычнага твора.

Індывідуальная імправізацыя з выкарыстаннем элементаў арганічнага руху – спалучэнне дыхання з рухам, мера напружання выконваемых рухаў, рытмічнае ўраўнаважванне пластычнай кампазіцыі.

### *Тэма 5. Пабудова статычнай кампазіцыі*

Структура мастацкай прасторы, мізансцэнічная сетка (цэнтральная і дадатковыя восі; тры сцэнічныя планы і прасцэніум; рэльеф). Ракурс – палажэнне акцёра адносна гледача або сцэнічнага аб’екта. Асноўныя ракурсы – фас, труакар (паўфас), профіль, спінны і паўспінны.

Тры віды прыбудоў П. М. Яршова і транзактны аналіз Э. Бэрна. Адпрацоўка прыбудоў да партнёра і да неадушаўлёных аб’ектаў сцэнічнай рэальнасці.

Разнастайныя прыбудовы на прыкладзе літаратурных і жывапісных твораў.

Спосаб пабудовы статычнай кампазіцыі па дамінуючым тыпе сцэнічнага дзеяння: бытавы, пластычны (акрабатыка, адзінаборствы, пластычна-вобразная тэхніка, пантаміма), танцавальны.

Развіццё скульптурнасці цела, «пачуцця позы». «Інстынкт прасторы» У. Меерхольда. Апраўданне статычнай кампазіцыі – позы, месцазнаходжання выканаўцы на пляцоўцы адносна партнёра, групы партнёраў, дэкарацыі, рэквізіту.

### *Тэма 6. Пабудова пластычнай фразы*

Дынамічныя элементы пластычнай фразы: траекторыя (прамая лінія, зігзаг, дуга, акружнасць і інш.), вектар (напрамак руху адносна аб’екта), «знакі прыпынку» (запавольванне, паскарэнне, працягласць знаходжання ў паўзе і інш.), хуткасць руху. Пабудова пластычнай фразы, камбінацыі на падставе дадзеных элементаў.

Дзеянне – мэтанакіраваны рух. Пераклад разнастайных фізічных рухаў у мэтанакіраванае дзеянне. Тры віды пластычнай рэакцыі – памкненне, адмаўленне, тармажэнне (ацэначная рэакцыя).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кампазіцыйныя прыёмы – «сінхрон», «работа фразамі» («канон», «кантраст»). Сінхроннае капіраванне пластыкі партнёра адносна плоскасці, лініі, кропкі. Капіраванне «ў цень», «у люстэрка». «Канон» – капіраванне пластыкі і канчатковай позы праз паўзу. «Кантраст» – пабудова пластычнай фразы, процілеглай па характары да фразы партнёра. Адпрацоўка навыку змены дыстанцыі пры размяшчэнні статычных поз падчас імправізацыйнай пабудовы фразы.

Апраўданне пераходу (траекторыі, хуткасці і інш.) адносна партнёра, групы партнёраў, дэкарацыі, рэквізіту.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 7. Прынцыпы псіхафізічнага ўзаемадзеяння з партнёрам*

Узаемадзеянне – невербальныя зносіны. Няспынны працэс успрымання–аддачы псіхафізічных імпульсаў партнёра (увага, адчуванні, пачуцці). Праяўленне адносін да аб'ектаў знешняга ці ўнутранага свету, на якія скіравана ўвага. Арганічны працэс узаемадзеяння. Матэрыял, аб'ект, сродкі і прыёмы ўзаемадзеяння. Прыстасаванне. Абавязковая форма пластычнага ўзаемадзеяння – «арганічнае маўчанне».

Элементы бясслоўнага дзеяння П. М. Яршова: ацэнка, прыбудова, уздзеянне.

«Трыяда» структурных элементаў выразнага дзеяння У. Меерхольда: намер–ажыццяўленне-рэакцыя.

Кантактнае кіраванне партнёрам – ад лёгкага дотыку да поўнага пераносу вагі цела на партнёра (ці наадварот). Бесконтактнае кіраванне – ацэнка дзеянняў партнёра або спыненне дзеянняў у яго бок (спосабам прыбудовы, змены ракурсу, эмацыянальнасцю позы, падтэкстам пераходу і інш.). Развіццё «пачуцця партнёра».

Трансфармацыя танцавальна-пластычных рухаў і камбінацый у спосабы псіхафізічнага ўздзеяння на партнёра. Пабудова дуэтнай імправізацыйнай кампазіцыі з элементамі псіхафізічнага ўзаемадзеяння.

### *Тэма 8. Прыёмы пластычна-вобразнай тэхнікі*

Асновы стылізацыі руху. Беспрадметныя дзеянні. Работа з творчым манком. Пантамімічныя прыёмы.

Ілюзія прасторы, моцы, цяжару, часу. Тэхніка: «сцяна», «сілавое поле», «паветраная падушка», «канат», «вецер». Сістэма практыкаванняў з тэхнікай «хваля». Пантамімічныя паходкі.

Міміка як сродак стварэння пантамімічнага вобраза. Дадатковыя выразныя сродкі пантамімы – свет, музычнае афармленне, шумавыя эфекты, рэквізіт, грым, сцэнічны касцюм.

Развіццё фантазіі і сцэнічнага ўяўлення сродкамі пластычна-вобразнай тэхнікі.

### *Тэма 9. Эмацыянальны рух*

Узаемасувязь характару знешняга дзеяння ў разнастайных абставінах і ўнутранага самаадчування чалавека.

Эмацыянальная памяць. Уласныя ўражанні, адчуванні, перажытыя пачуцці і суперажыванне эмацыянальнаму, жыццёваму вопыту другога чалавека. Выхаванне ўмення выклікаць да дзеяння паўторныя ўспаміны, пачуцці, перажыванні. Пераўтварэнне суперажывання ва ўласнае, сапраўднае пачуццё.

Спосабы абуджэння эмоцый і пачуццяў у сітуацыі публічнага паказу (практыкаванні на прапанаваныя абставіны; на прадуктыўнае, мэтанакіраванае дзеянне; на выкананне творчай задачы). Рэфлекторная ўзбудлівасць, спосаб правакавання эмоцыі «ад знешняга да ўнутранага» У. Меерхольда. М. А. Чэхаў аб эмацыянальнасці руху. Дзеянні з пэўнай афарбоўкай. Псіхалагічны жэст.

Аналіз знешніх сродкаў выразнасці (кампаненты стварэння атмасферы: эфекты асвятлення, шумы, каляровае вырашэнне дэкарацый, абсталявання), што ўплываюць на псіхічны стан акцёра.

### *Тэма 10. Праца акцёра над роляй*

Аналіз літаратурнага твора, музычнай кампазіцыі, танцавальнага кірунку, абраных для пастаноўкі. Тэма, ідэя, сэнсавыя задачы твора. Вызначэнне канфлікту твора – сутыкненне інтарэсаў, задач персанажаў і інш. Скразное дзеянне кожнай дзеючай асобы ў дасягненні сваёй мэты. Рад падзей. Звышзадача.

Суаднясенне дзеянняў, учынкаў героя развіццю драматычнай сітуацыі, тэме ўрыўка. Вызначэнне светапогляду героя.

Звышзадача – скразное дзеянне – зерне ролі. Мадэліраванне ланцужка фізічных дзеянняў на аснове рабочага матэрыялу. Раскрыццё эмацыянальнай лініі персанажа. «Апраўданне» логікі дзеяння свайго персанажа. Аўтарская трактоўка, інтэрпрэтацыя мастацкага вобраза.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 11. Характарнасць вобраза*

Віды характарнасці. Прыродна-фізіялагічная (узрост, вага, рост, здароў'е, інтэлект, тып цэнтральнай нервовай сістэмы, формула характару), прафесійная (род асноўных заняткаў, уплыў на паводзіны мінулых звычак, звязаных з працоўнай дзейнасцю, сацыяльным становішчам і інш.), нацыянальная знешняя характарнасць.

Твар, позы, паходкі, манеры, паводзіны, індывідуальныя жэсты і пластыка, эмацыянальная ўзбуджанасць дадзенага персанажа. Вострахарактарная і стылізаваная пластыка вобраза.

Развіццё і спалучэнне эмацыянальнага (суперажыванне персанажу), зрокавага (уяўленне, бачанне персанажа ў прапанаваных абставінах) і пластычнага ўвасаблення фігуры другога чалавека.

Жыццёвыя назіранні як матэрыял для пабудовы характарнасці вобраза.

Пошук і адбор фізічных дзеянняў, найбольш характарызуючых сутнасць вобраза.

### *Тэма 12. Эцюдная работа*

Структура эцюда: завязка, развіццё дзеяння, кульмінацыя, развязка.

Ідэя эцюда, распрацоўка пастановачнага плана. Разуменне сувязі падзей, логікі ўчынкаў і дзеянняў герояў эцюда. Даследаванне формы эцюда і харэаграфічнай лексікі праз сувязь з музычнай драматургіяй (сэнсавыя акцэнты, значнасць мізансцэн, кульмінацыі і г.д.). Работа рэжысёра-балетмайстра з выканаўцамі.

Тэхнічнае апісанне эцюда. Сачыненне лібрэта.

Віды эцюдаў (эцюд – назіранне, эцюд «моўчкі ўдвух», эцюд на апраўданне (дзейснай задачы, аб'екта ўвагі і інш.), эцюд па карціне, эцюд – асацыяцыя, эцюд – фантазія і інш.).

Эцюды на псіхафізічнае ўзаемадзеянне з партнёрам на аснове танцавальна-пластычных тэхнік, вывучаных як у межах дысцыпліны, так і на асноўных харэаграфічных дысцыплінах.

Этыка і дысцыпліна творчага калектыву. Сцэнічная культура.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Ершов, П. М.* Логика и техника бессловесных элементов действия / П. М. Ершов // Технология актерского искусства / П. М. Ершов. – М. : ТОО «ГОРБУНОК», 2002. – С. 84–105.

2. *Митта, А. Н.* Драматическая ситуация / А. Н. Митта // Кино между адом и раем / А. Н. Митта. – М. : Зебра Е, 2005. – С. 49–83.

3. *Мочалов, Ю.* Учебный класс / Ю. Мочалов // Композиция сценического пространства. Поэтика мизансцены / Ю. Мочалов. – М. : Просвещение, 1981. – С. 116–138.

4. *Немеровский, А.* Пластическая выразительность актера / А. Немеровский. – М. : Искусство, 1988. – С. 13–33.

5. *Новицкая, Л. П.* Освобождение мышц / Л. П. Новицкая // Уроки вдохновения / Л. П. Новицкая. – М. : Искусство, 1984. – С. 226–235.

6. *Сенчуков, Ю. Ю.* Движение и дыхание / Ю. Ю. Сенчуков // Искусство пресечения боя / Ю. Ю. Сенчуков. – Минск : Современное слово, 2000. – С. 64–68.

7. *Станиславский, К. С.* Этика и дисциплина / К. С. Станиславский // Собр. соч. : в 8 т. – М. : Искусство, 1954–1961. – Т. 3. – С. 237–267.

8. *Чехов, М. А.* Воображение и внимание / М. А. Чехов // Литературное наследие. Т. 2 / М. А. Чехов. – М. : Искусство, 1995. – С. 171–176.

*Дадатковая*

1. *Бернштейн, Н. А.* Биомеханика для инструкторов / Н. А. Бернштейн // Биомеханика и физиология движений : избранные психологические труды / под ред. В. П. Зинченко. – Воронеж : Изд-во НПО «МОДЭК», 2004. – С. 514–665.

2. *Бродецкий, А. Я.* Структура художественного пространства / А. Я. Бродецкий // Внеречевое общение в жизни и в искусстве : Азбука молчания / А. Я. Бродецкий. – М. : Гуманит. изд. центр ВЛАДОС, 2000. – С. 145–160.

3. *Гладков, К. Г.* Самоограничение, импровизация, ритм, ассоциации. О разном / К. Г. Гладков // Мейерхольд. Т. 2 / К. Г. Гладков. – М. : СТД, 1990. – С. 332–344.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. *Демидов, Н. В.* Образ. Перевоплощение / Н. В. Демидов // Творческое наследие. Т. 3. Кн. 4 : Творческий художественный процесс на сцене / под ред. М. Н. Ласкиной. – СПб. : Нестор-История, 2007. – С. 292–338.

5. *Козлов, В. В.* Свободное дыхание как целостная интегративная психотехнология / В. В. Козлов // Психотехнологии измененных состояний сознания. Личностный рост. Методы и техники / В. В. Козлов. – М. : Изд-во Ин-та психотерапии, 2001. – С. 124–157.

6. *Никитин, В. Н.* Техники выразительного движения / В. Н. Никитин // Энциклопедия тела / В. Н. Никитин. – М. : Алетейя, 2000. – С. 434–471.

7. *Песочинский, Н.* Вс. Мейерхольд о своем методе. 1914–1936 / Н. Песочинский // Мейерхольд : к истории творческого метода : сб. ст. – СПб. : КультИнформПресс, 1998 – С. 32–38.

8. *Рождественская, Н. В.* Критерии профессионализма актера / Н. В. Рождественская // Диагностика актерских способностей / Н. В. Рождественская. – СПб. : Речь, 2005. – С. 33–46.

9. *Савостьянов, А. И.* Сценическое творчество и психогигиена / А. И. Савостьянов // Общая и театральная психология / А. И. Савостьянов. – СПб. : КАРО, 2007. – С. 159–163.

10. *Сенчуков, Ю. Ю.* Центр тяжести и центр силы / Ю. Ю. Сенчуков // Искусство пресечения боя / Ю. Ю. Сенчуков. – Минск : Современное слово, 2000. – С. 85–86.

11. *Соснова, М.Л.* Цели и задачи обучения, воспитания и развития студента-актера / М. Л. Соснова // Искусство актера : учеб. пособие для вузов / М. Л. Соснова. – М. : Академический проект : Фонд «Мир», 2005. – С. 360–371.

12. *Станиславский, К. С.* Упражнения и этюды / К. С. Станиславский // Собр. соч. : в 8 т. – М. : Искусство, 1954–1961. – Т. 3. – С. 379–392.

13. *Фельденкрайз, М.* Выявление маленьких различий / М. Фельденкрайз // Искусство движения / М. Фельденкрайз. – М. : ЭКСМО, 2003. – С. 24–48.

14. *Филатов, С. В.* Воспитание танцевальной выразительности и освоение техники классического танца / С. В. Филатов // От образного слова к выразительному движению / С. В. Филатов. – М. : Магистр, 1992–1993. – С. 9–15.

15. *Хрящева, Н. Ю.* Тренинг креативности / Н.Ю.Хрящева // Психогимнастика в тренинге / Н. Ю. Хрящева. – СПб. : Речь, 2000. – С. 102–146.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Спіс відэаматэрыялаў

**Тэма 1. Прырода акцёрскай ігры**

1. Карлос Саура, «Кармен» (1983)
2. Даррен Аронофски, «Черный лебедь» (2010)
3. World Super Star Dance Festival Latin (2004)

**Тэма 2. Сцэнічная ўвага**

1. Билл Вудрофф, «Honey» (2003)
2. Баз Лурман, «Австралийское танго» (1992)

**Тэма 3. Вызваленне мышцаў ад заціску**

1. Нэнси Мейерс, «О чем думают женщины» (2000)
2. Джек Хейли, «That is Entertainment» (1974)

**Тэма 4. Тэмпарытм сцэнічнага дзеяння**

1. Реджис Обадиа, «Комната» (1988)
2. Люк Крессвел, «STOMP» (1997)

**Тэма 5. Пабудова статычнай кампазіцыі**

1. Иржи Килиан, «Kaguyahime» (1994)
2. Баз Лурман, «Moulin Rouge» (2001)

**Тэма 6. Пабудова пластычнай фразы**

1. Збигнев Рыбчински, «Танго» (1981)
2. Валерий Тодоровский, «Стиляги» (2008)

**Тэма 7. Прынцыпы псіхафізічнага ўзаемадзеяння з партнёрам**

1. Реджис Обадиа, «Свадьба» (1990)
2. Стив Пекстон, «Fall after Newton» (1987)

**Тэма 8. Прыёмы пластычна-вобразнай тэхнікі**

1. Чарли Чаплин, «Огни большого города» (1931)
2. Марсель Марсо, «Сколько весит душа» (1992)

**Тэма 9. Эмацыянальны рух**

1. Питер Челсом, «Давайте потанцуем?» (2004)
2. Реджис Обадиа, «Объятия» (1988)

**Тэма 10. Праца акцёра над роляй**

1. Л.Квинихидзе, «Небесные ласточки» (1976)
2. Роб Маршалл, «Chicago» (2002)
3. Боб Фосс, «Cabaret» (1972)

**Тэма 11. Характарнасць вобраза**

1. Роберт Вайс, «West Side Story» (1961)
2. Чарльз Талар, «Notre Dame de Paris» (1998)
3. Матс Эк, «Carmen» (1992)

**Тэма 12. Эцюдная работа**

1. Боб Фосс, «All that Jazz» (1979)
2. Мастерская эстрадного танца Л. и А. Ефремовых, «Танцы в красном», «Белый голубь» (2004)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці

| Балы | Паказчыкі ацэнкі |
|---|---|
| 1 (адзін) | Адсутнасць ведаў і кампетэнцыі ў рамках адукацыйнага стандарту.<br>Аддаленае падабенства выкананага рухальнага навыку з эталонам, адрозненне ад яго па тэмпе, амплітудзе, з грубымі памылкамі, якія цяжка паддаюцца выпраўленню.<br>Фармальнае выкананне пастаўленых педагогам задач.<br>Пасіўнасць на практычных і індывідуальных занятках |
| 2 (два) | Фрагментарныя веды ў рамках адукацыйнага стандарту; неразуменне і невыкарыстанне спецыяльнай тэрміналогіі.<br>Выкананне рухальных навыкаў на ўзроўні свядомасці, з павышаным напружаннем, з неабгрунтаванымі затрымкамі, са значнымі адхіленнямі ад зададзенай праграмы, з моцна парушаным рытмам.<br>Фармальнае выкананне пастаўленых педагогам задач.<br>Пасіўнасць на практычных і індывідуальных занятках |
| 3 (тры) | Недастатковы аб’ём ведаў і кампетэнцыі ў межах адукацыйнага стандарту; веданне тэрмінаў і паняццяў абмяжоўваецца іх найменнем, без здавальняючага разумення. Неразуменне прыкладаў мадэлявання сцэнічнай сітуацыі.<br>Выкананне рухальных навыкаў на ўзроўні свядомасці, з павышаным напружаннем, з прыкметнымі адхіленнямі ад зададзенай праграмы, з моцна парушаным рытмам.<br>Наяўнасць грубых памылак, якія ліквідуюцца з дапамогай выкладчыка; выпраўленыя варыянты сцэнічных паводзін не замацоўваюцца.<br>Фармальнае выкананне пастаўленых педагогам задач.<br>Неўжыванне атрыманых ведаў і ўменняў пры выкананні навучальных заданняў.<br>Пасіўнасць на практычных і індывідуальных занятках |
| 4 (чатыры) | Дастатковы аб’ём ведаў у межах адукацыйнага стандарту; у выкарыстанні паняццяў і спецыяльнай тэрміналогіі сустракаюцца памылкі. Для ўсведамлення прыкладаў мадэлявання сцэнічнай сітуацыі патрабуецца некаторы час.<br>Дэманстрацыя тэхнікі выканання асобных элементаў і практыкаванняў па засваенні акцёрскай тэхнікі на дастатковым узроўні. Выкананне рухальных навыкаў і дзейнасці праводзіцца пад кантролем свядомасці, з неапраўданым напружаннем, з нязначнымі адхіленнямі ад зададзенай праграмы, з прыкметным парушэннем рытму.<br>Пастаянная патрэбнасць у карэкцыі і падтрымцы з боку педагога. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| | Няправільнае выкарыстанне навыкаў, атрыманых пры засваенні сумежных дысцыплін.<br>Фармальны ўдзел у вучэбна-творчым працэсе |
| 5<br>(пяць) | Дастатковыя веды ў аб’ёме навучальнай праграмы; адчуванне няўпэўненасці ў выкарыстанні спецыяльных тэрмінаў і паняццяў. Разуменне прыкладаў мадэлявання сцэнічнай сітуацыі.<br>Дэманстрацыя тэхнікі выканання асобных элементаў і практыкаванняў па засваенні акцёрскай тэхнікі на дастатковым узроўні. Самастойнае выкананне рухальнага навыку (дзейнасці), часткова пад кантролем свядомасці, з нязначнымі адхіленнямі ад зададзенай праграмы і рытму.<br>Патрэбнасць у карэкцыі і падтрымцы з боку педагога.<br>Недастаткова правільнае выкарыстанне навыкаў, атрыманых пры засваенні сумежных дысцыплін.<br>Удзел у вучэбна-творчым працэсе |
| 6<br>(шэсць) | Дастаткова поўныя веды ў аб’ёме навучальнай праграмы; валоданне паняццямі і спецыяльнай тэрміналогіяй. Наяўнасць цяжкасцей у прывядзенні прыкладаў мадэлявання сцэнічнай сітуацыі.<br>Валоданне навыкам трансфармацыі танцавальна-пластычных рухаў і камбінацый у прыёмы псіхалагічнага ўздзеяння на партнёра на сярэднім тэхнічным узроўні. Самастойнае выкананне іграввой дзейнасці, не напружана, з нязначнымі адхіленнямі ад зададзенай праграмы і рытму.<br>Выкананне пастаўленых педагогам вучэбна-творчых задач з нязначнымі памылкамі. Вырашэнне іх з дапамогай педагога і частковае замацаванне прапанаваных змен.<br>Выкарыстанне атрыманых ведаў і ўменняў пры падрыхтоўцы творчых работ.<br>Удзел у вучэбна-творчым працэсе. Сфарміраванасць патрэбы ў самастойнай творчай працы |
| 7<br>(сем) | Поўныя веды па асобных раздзелах навучальнай праграмы. Назіраецца ўпэўненасць у выкарыстанні спецыяльных тэрмінаў і паняццяў. Наяўнасць адэкватных прыкладаў мадэлявання сцэнічнай сітуацыі.<br>Выкарыстанне дадзеных праграмных элементаў у пабудове індывідуальнай імправізаванай кампазіцыі на сярэднім тэхнічным узроўні.<br>Самастойнае выкананне іграввой дзейнасці ў адпаведнасці з зададзенай праграмай, рытмічна.<br>Наяўнасць неістотных памылак у рэалізацыі сцэнічных задач і выкарыстанні навыкаў, атрыманых пры засваенні сумежных дысцыплін. Паспяховае самастойнае выпраўленне памылак пасля абмеркавання.<br>Актыўнасць у вучэбна-творчым працэсе |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| 8 (восем) | Поўныя веды па асобных раздзелах навучальнай праграмы. Упэўненае валоданне паняццямі і спецыяльнымі тэрмінамі. Лёгкасць у падборы адэкватных прыкладаў мадэлявання сцэнічнай сітуацыі.<br>Выкарыстанне дадзеных праграмных элементаў у пабудове дуэтнай імправізаванай кампазіцыі на сярэднім тэхнічным узроўні. Выкананне іградой дзейнасці самастойнае, асэнсаванае, свабоднае, на поўнай амплітудзе.<br>Паспяховая работа з праграмным матэрыялам у працэсе рэпетыцыі, але адчуванне цяжкасцей ва ўмовах публічнага паказу.<br>Прымяненне атрыманых ведаў і ўменняў пры самастойнай падрыхтоўцы творчых работ.<br>Актыўнасць у вучэбна-творчым працэсе |
| 9 (дзевяць) | Поўныя веды па ўсіх пастаўленых пытаннях у аб'ёме навучальнай праграмы. Выкарыстанне спецыяльнай тэрміналогіі для аналізу сцэнічных вобразаў і навучальных сітуацый.<br>Здольнасць замацоўваць імправізавана знойдзеныя мізансцэны і будаваць на іх падставе эцюдную кампазіцыю на высокім узроўні выканальніцкай тэхнікі. Існаванне ў прапанаваных абставінах ролі ажыццяўляецца праўдападобна ва ўмовах рэпетыцыі і публічнага паказу.<br>Разуменне пастаўленых вучэбна-творчых задач рознай ступені складанасці, арганічнасць і выразнасць у іх сцэнічным увасабленні.<br>Правільнае выкарыстанне навыкаў, атрыманых пры засваенні сумежных дысцыплін у падрыхтоўцы навучальных і самастойных работ.<br>Ініцыятыўнасць у вучэбна-творчым працэсе |
| 10 (дзесяць) | Поўныя і сістэматызаваныя веды па ўсіх пастаўленых пытаннях у аб'ёме навучальнай праграмы. Дакладнае выкарыстанне спецыяльнай тэрміналогіі пры аналізе з'яў тэатральнага мастацтва.<br>Дэманстрацыя здольнасцей ажыццявіць пастаноўку харэаграфічнай кампазіцыі з выкарыстаннем тэатральных прыёмаў на высокім узроўні выканальніцкай тэхнікі. Існаванне ў прапанаваных абставінах ролі ва ўмовах публічнага паказу ажыццяўляецца арганічна, праўдападобна, эмацыянальна заразліва. Разуменне звышзадачы ролі і імкненне ўвасобіць яе ў сваім выкананні з праявай эстэтычнага густу.<br>Дэманстрацыя свабоднага валодання праграмным матэрыялам з выкарыстаннем уменняў і навыкаў з іншых адукацыйных дысцыплін пры падрыхтоўцы навучальных і самастойных работ.<br>Ініцыятыўнасць у вучэбна-творчым працэсе |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Рэкамендаваныя сродкі дыягностыкі

Для дыягностыкі прафесійнай кампетэнцыі, выяўлення ўзроўню навучальных дасягненняў студэнтаў рэкамендуецца выкарыстоўваць наступны інструментарый:

1. Комплексныя рознаўзроўневыя заданні:

– тэхніка выканання асобных элементаў і практыкаванняў па засваенні акцёрскай тэхнікі;

– трансфармацыя танцавальна-пластычных рухаў і камбінацый у прыёмы псіхалагічнага ўздзеяння на партнёра;

– імправізаванае аб’яднанне элементаў па тэмах праграмы;

– праект стварэння танцавальна-драматычнага эцюда.

2. Вуснае апытанне студэнтаў.

3. Пісьмовая распрацоўка пастановачнага плана ці мастацкае апісанне эцюда (лібрэта).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**МАЙСТЭРСТВА АКЦЁРА**

*Тыпавая вучэбная праграма*
*для ўстаноў вышэйшай адукацыі па напрамках спецыяльнасці*
*1-17 02 01-04 Харэаграфічнае мастацтва (народны танец),*
*1-17 02 01-05 Харэаграфічнае мастацтва (бальны танец),*
*1-17 02 01-06 Харэаграфічнае мастацтва (эстрадны танец)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк .12.2012. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,16. Ул.-выд. арк. 0,80. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
ЛИ № 02330/0003939 ад 19.05.2011.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

*Тыпавая вучэбная праграма*
*для ўстаноў вышэйшай адукацыі па напрамках спецыяльнасці*
*1-17 02 01-04 Харэаграфічнае мастацтва (народны танец),*
*1-17 02 01-05 Харэаграфічнае мастацтва (бальны танец),*
*1-17 02 01-06 Харэаграфічнае мастацтва (эстрадны танец)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск
БДУКМ
2012